ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
Чавускага раённага
выканаўчага камітэта
___________ Г.М.Падворная
«____»_____________2026г.

ПАЛАЖЭННЕ
аб XIII міжрэгіянальным сваце-конкурсе «Зялёныя святкі»

1. **Мэты і задачы:**
- адраджэнне, захоўванне і папулярызацыя самабытнай фальклорнай культуры, традыцый рэгіянальнага напрамку;
- выяўленне і вяртанне ў практыку разнастайных формаў асноўных відаў жанраў аўтэнтычнага фальклору сваёй мясцовасці;
- абмен вопытам і прапаганда народных свят рэгіёнаў вобласці;
- развіццё ўзаемаадносін паміж рэгіёнамі вобласці ў сферы культуры;
- выхаванне і далучэнне дзяцей, моладзі і падлеткаў да традыцыйнай культуры і мастацкіх рамёстваў.

2. **Арганізатары свята-конкурса:**

Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чавускага раёна»

3. **Заснавальнікі свята-конкурса:**

Сектар культуры Чавусскага раённага выканаўчага камітэта

4. **Умовы свята-конкурса:**

XIII міжрэгіянальнае свята-конкурс «Зялёныя святкі» праводзіцца **31 мая 2026 г**. на тэрыторыі крыніц «Байкава» Чавускага раёна Магілёўскай вобласці Рэспублікі Беларусь, пачатак у **11.00**.

У рамках свята-конкурса арганізаваны:
- выстава, выстава-продаж прыкладнога мастацтва народных майстроў і ўмельцаў, харчовай прадукцыі;
- спартыўныя і дзіцячыя пляцоўкі;
- конкурсы рэгіянальных карагодаў, аўтэнтычных спеваў, традыцыйных пачастункаў, траецкіх вянкоў;

На свята запрашаюцца ўмельцы і майстры народных мастацкіх рамёстваў рэгіёнаў вобласці са сваёй выставай дэкаратыўна-прыкладнога напрамку, выставай-продажам, аматарскія калектывы

аўтэнтычнага (этнаграфічнага), фальклорнага напрамку рознай узроставай групы.

Удзельнікі конкурсу могуць праявіць сябе ў наступных намінацыях:

«Лепшы карагод»;

«Аўтэнтычныя спевы»;

«Лепшы традыцыйны пачастунак»;

«Лепшы траецкі вянок».

Удзельнікі конкурсу могуць прымаць удзел як у адной, так і ў некалькіх намінацыях.

У намінацыі **«Лепшы карагод»** калектыў прадстаўляе 1 карагод, калі такі існаваў у рэгіёне, працягласцю да 5 хвілін. Карагод можа суправаджацца абрадавым дзеяннем «Кумленне» («Кумаванне») і траецкімі спевамі.

У намінацыі **«Аўтэнтычныя спевы»** калектыў або індывідуальны выканаўца прадстаўляе 2 пазаабрадавыя песні (жартоўная і лірычная), якія спявалі ў любы час у сваім рэгіёне. Працягласць – да 8 хвілін.

У намінацыі **«Лепшы традыцыйны пачастунак»** калектыў або індывідуальны выканаўца прэзентуе пачастунак, які гатуецца ці гатавалі непасрэдна на Свята Троіцы ў сваім рэгіёне. Працягласць презентацыі – да 2 хвілін.

У намінацыі **«Лепшы траецкі вянок»** прымаюць удзел умельцы, майстры народных мастацкіх рамёстваў, удзельнікі клубных фарміраванняў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, спецыялісты клубных арганізацый. Удзельнік прадастаўляе на конкурс 1 вянок, зроблены ў 2026 годзе, дыяметр акружнасці якога не больш за 30 см. Вянок павінен быць зроблен з традыцыйных або прыродных матэрыялаў. Конкурсная работа павінна суправаджацца таблічкай, прыкрэпленай к вянку, з абазначэннем назвы конкурснай работы, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, назвы арганізацыі і раёна.

Конкурсныя работы будуць размешчаны на адной выставе.

5. **Крытэрыі свята-конкурса:**

- захаванне і развіццё традыцый мясцовага напрамку;
- выкарыстанне традыцыйных рэгіянальных касцюмаў, атрыбутаў;
- аўтэнтычнасць рэгіянальных карагодаў;
- рэгіянальныя асаблівасці вырабу траецкіх вянкоў, аўтэнтычных спеваў, прыгатавання традыцыйнага пачастунка;
- узровень выканаўчага майстэрства;
- развіццё пераемнасці пакаленняў.

6. **Заяўкі на ўдзел у святе-конкурсе** прадстаўляюцца да **27.05.2026 г.** па электроннай пошце metod.rckid@yandex.by (дадатак 1, дадатак 2, дадатак 3)

7. **Падвядзенне вынікаў свята-конкурса:**

Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца Дыпломамі I, II, III ступені у кожнай намінацыі. Каштоўнымі падарункамі ўзнагарожваюцца пераможцы I ступені. Журы мае права дзяліць колькасць дыпломаў адной ступені паміж удзельнікамі.

Па рашэнню журы ўдзельнікі могуць узнагароджвацца спецыяльнымі дыпломамі **«За захаванне і развіццё традыцый мясцовага напрамку», «Пераемнікі традыцый».**

Удзельнікі конкурсу, якія не занялі прызавыя месцы, узнагароджваюцца дыпломамі ўдзельніка.

Рашэнне журы пратакалюецца, з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

Дыпломамі ўдзельніка ўзнагароджваюцца ўмельцы дэкаратыўна-прыкладнога напрамку і майстры народных мастацкіх рамёстваў, не заяўленыя ў конкурсе «Траецкі вянок».

**Фінансавыя выдаткі** па арганізацыі і правядзенню свята-конкурса выконвае дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чавускага раёна» за кошт сродкаў раённага бюджэту, а таксама ўласных сродкаў.

8. **Камандыровачныя і транспартныя сродкі** за кошт накіруючага боку.

**Кантакты арганізатараў конкурса «Зялёныя святкі»:**

Дзяржаўная установа культуры «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чавускага раёна»

213206, вул. Ленінская, 28, г.Чавусы, Магілёўская вобл., Рэспубліка Беларусь.

Тэлефоны:

8(02242)7-88-97; +375296080782, +375297446348 (*Далецкая Алеся Віктараўна*, загадчык аддзела традыцыйнага мастацтва і рамёстваў раённага Цэнтра культуры і вольнага часу)

E-mail: metod.rckid@yandex.by

Дадатак 1

АНКЕТА-ЗАЯЎКА
на ўдзел у XIII міжрэгіянальным свяце-конкурсе
«Зялёныя святкі»
у намінацыях «Лепшы карагод», «Аўтэнтычныя спевы»,
«Лепшы традыцыйны пачастунак»

| | |
|---|---|
| Раён (горад) | |
| Поўная назва калектыва або індывідуальнага выканаўца *з назвай установы і ведамаснай прыналежнасцю* | |
| Краткая характарыстыка аб творчай дзейнасці калектыва або індывідуальнага выканаўца | |
| Юрыдычны адрас установы, тэл. | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыва і кантактныя дадзеныя для сувязі | |
| Намінацыі *(у якіх намінацыях прымае ўдзел калектыў або індывідуальны выканаўца )* | |
| Працяг выступлення | |
| Колькасць удзельнікаў творчай групы | |
| Тэхнічны райдэр | |

*З палажэннем азнаёмлены*____________________
*«__»*______________*2026*

Подпіс кіраўніка

Дадатак 2

АНКЕТА-ЗАЯЎКА
на ўдзел у XIII міжрэгіянальным свяце-конкурсе
«Зялёныя сняткі»
у намінацыі «Траецкі вянок»

| | |
|---|---|
| Раён (горад) | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара *(пасада)* ці поўная назва творчага калектыва *з назвай установы і ведамаснай прыналежнасцю* | |
| Назва конкурснай работы | |
| Кантактныя дадзеныя для сувязі | |

*З палажэннем азнаёмлены*___________________
*«__»*______________*2026*

Подпіс кіраўніка

Дадатак 3

АНКЕТА-ЗАЯЎКА
на ўдзел у выставе ў рамках XIII міжрэгіянальнага свята-конкурса
«Зялёныя сяткі»

| | |
|---|---|
| Раён (горад) | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку **майстра** *з назвай установы і ведамаснай прыналежнасцю* | |
| Від дзейнасці | |
| Кантактныя дадзеныя для сувязі | |
| Тэхнічны райдэр | |

*З палажэннем азнаёмлены*___________________
*«__»______________2026*

Подпіс кіраўніка